# ДАРАЖЭЙ ЗА ЖЫЦЦЁ НЯМА НІЧОГА...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

І вось ягадкі саспелі. І праявіліся ў росце колькасці пажараў і вытворчым траўматызме. Да апошняга прыгледзімся больш уважліва.

## Часцей гінуць дасведчаныя...

**Галоўны тэхнічны інспектар працы ФПБ Павел МАНЬКО** звяртае ўвагу на лічбы:

— Па звестках Дэпартамента дзяржінспекцыі працы Мінпрацы і сацыяльнай абароны, летась у арганізацыях краіны ў выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці загінулі 144 работнікі, 700 чалавек атрымалі цяжкія траўмы. У 2017-м лічбы былі меншыя: 115 і 593, адпаведна, — кажа ён. — Пагадзіцеся, плюс 29 загінулых — гэта зашмат...

Далі рост усе рэгіёны без выключэння. Больш падрабязна з данымі можна пазнаёміцца з нашай інфаграфікі.

Трэба адзначыць, што 24 лятальныя выпадкі на рабоце адбыліся, калі іх ахвяры былі пад чаркай і ў такім жа стане былі 35 чалавек з цяжкатраўмаваных.

Сумнае лідарства традыцыйна ўтрымліваюць такія галіны, як цяжкая прамысловасць, будаўніцтва, транспарт і сельская гаспадарка. На іх прыпадае крыху больш за 90 % ад усіх астатніх галін дзейнасці. Небяспека тоіцца падчас выканання вясенне-палявых работ і ўборачнай кампаніі, рамонту транспартных сродкаў і сезона актыўнага будаўніцтва. У кожнай з гэтых галін ёсць свае праблемы: гэта і зношанасць асноўных сродкаў, несвоечасовае забеспячэнне сродкамі індывідуальнай абароны, невыкарыстанне іх самімі работнікамі, цяжкасць у правядзенні перыядычнага кантролю, несвоечасовая выплата заробкаў, нястача сродкаў і гэтак далей.

Цікава, але факт: найбольш траўманебяспечныя дні — панядзелак і пятніца. На кожны з іх прыпадае амаль па 19 % усіх выпадкаў.

Яшчэ адна асаблівасць: траўмуюцца і гінуць не маладыя і зялёныя, а вопытныя, з вялікім стажам работнікі. Згодна з аналізам, праведзеным ФПБ, амаль палова цяжка траўмаваных была ва ўзросце 46—60 гадоў, без малога 30 % — мелі стаж ад 21 да 30 гадоў. Чаму ўсё ж такі няшчасны выпадак здарыўся? Суразмоўнік лічыць, што пачуццё страху ў такога работніка ўжо прытупляецца і інстынкт самазахавання не спрацоўвае, бо даўні тэхналагічны працэс ён выконваў кожны дзень і можа гэта зрабіць нават «з заплюшчанымі вачамі». Вынік такой упэўненасці доўга чакаць не даводзіцца.

> Вялікую ўвагу аддаём колькасці прадукцыі, а забываем аб работніку, яго ўмовах працы. Сказваецца стомленасць, эмацыянальная напружанасць, манатоннасць і ў той жа час складанасць працы.

— Зразумела, побач з кожным наглядчыкам не паставіш і не звядзеш сумную статыстыку да нуля: на вытворчасці як гінулі, так і будуць гінуць, але наша задача — максімальна садзейнічаць таму, каб колькасць няшчасных выпадкаў памяншалася год ад году, — кажа тэхінспектар.

## Інстытут грамадскіх інспектараў працы

Адной з прычын росту вытворчага траўматызму Павел Манько называе гонку прадукцыйнасці.

— Пры гэтым вялікую ўвагу аддаём колькасці прадукцыі, а забываем аб работніку, яго ўмовах працы. Сказваецца стомленасць, эмацыянальная напружанасць, манатоннасць і ў той жа час складанасць працы, — упэўнены ён.

Што рабіць? Быць больш пільнымі: і работнікам, і наймальнікам, і тым, хто можа яшчэ ўплываць на сітуацыю з аховай працы. Так, з вядзеннем мараторыя на планавыя праверкі 10 гадоў таму, кантрольным і наглядным органам вобразна паказалі на дзверы. Толькі прафсаюзы яшчэ могуць бесперашкодна трапляць на прадпрыемствы з мэтай правядзення маніторынгаў, у тым ліку за станам аховы працы. Але трэба ўлічваць той факт, што прафілактыка і вобразны бізун — рэчы розныя. Задача прафсаюзнага грамадскага кантролю — дапамагаць у пошуку недахопаў і падказваць наймальніку, як выправіць хібы, каб на вытворчасці не дайшло да трагедыі.

Менавіта таму з 1 мая ў краіне пачаў дзейнічаць інстытут грамадскіх інспектараў працы. Гаворка аб тым, што ва ўсіх раённых і гарадскіх аб'яднаннях прафсаюзаў на грамадскіх пачатках пачалі працаваць дасведчаныя ў пытаннях аховы працы людзі. З пачатку лета яны пачнуць актыўна працаваць на месцах.

Але ёсць адно важкае АЛЕ, і завецца яно падмена паняццяў. На грамадскі кантроль нельга перакладваць цяжар адказнасці за стан па ахове працы. І вось тут варта зноў прыгадаць вобразны бізун, аб якім ужо неадназова казалі. Суразмоўнік упэўнены: з адменай планавых праверак наймальнікі расслабіліся, бо колькі ні падказвай, але калі пакаралі рублём — даходзіць лепей.

— Задача прафсаюзаў — праводзіць прафілактыку вытворчага траўматызму, а вось кантраляваць павінны тыя, хто мае карныя паўнамоцтвы, — упэўнены ён.

Ініцыятыва ФПБ выглядае даволі лагічнай: даць магчымасць праводзіць пазапланавыя праверкі не ўсім кантрольна-наглядным органам, а толькі Дэпартаменту дзяржінспекцыі працы і МНС (бо ратавальнікі адказваюць за электрабяспеку), прыпыніўшы ў гэтым пункце дзеянне мараторыя.

### ❍ Толькі лічбы

У 2018 годзе адбылося 40 групавых няшчасных выпадкаў, у выніку якіх пацярпелі 105 чалавек, з якіх 15 чалавек загінулі і 28 атрымалі цяжкія вытворчыя траўмы. У параўнанні з 2017-м колькасць смяротна траўмаваных вырасла амаль у 1,7 раза, а пацярпелых, што атрымалі цяжкія вытворчыя траўмы, паменшылася амаль у 1,5 раза.

У 2017 годзе абдылося 36 групавых няшчасных выпадкаў, у выніку якіх пацярпелі 108 работнікаў, у тым ліку 9 чалавек загінулі і 36 атрымалі цяжкія траўмы.

## Замест пасляслоўя

Так, рост вытворчага траўматызму амаль на 20 % — гэта жахліва, і ў барацьбе за жыццё і здароўе людзей будуць прыдатныя ўсе сродкі. Але гаворка будзе няпоўнай, калі не закрануць яшчэ адну лічбу статыстыкі, што датычыцца смерцяў на рабочых месцах. Вышэй мы казалі аб звязаных з вытворчасцю і афармленых актамі формы Н-1. Між іншым, ёсць і тыя, што пайшлі на работу і... не вярнуліся. Кажучы сухой мовай, памерлі ад натуральных прычын.

Па словах Паўла Манько, летась 598 чалавек памерлі на рабоце, 400 з якіх — з-за стану свайго здароўя. Чаму лічба такая вялікая? Спецыялісты лічаць, што многія работнікі стараюцца не раскрываць наймальнікам сваіх дыягназаў, каб не страціць работу. Іншая справа, што ў 93 % памерлых на рабоце былі ў наяўнасці медыцынскія прафагляды. Але гэта ўжо пытанне да якасці іх правядзення і зусім іншая, як кажуць, гісторыя...

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

### Колькасць загінулых на вытворчасці




Па аператыўнай інфармацыі тэхінспекцыі ФПБ.

### Колькасць цяжкатраўмаваных на вытворчасці




Інфаграфіка Ірыны ТАМКОВІЧ.